Сурганаў Ф. А. (Дзяржынская выбарчая акруга горада Мінска). Таварышы дэпутаты! Пытанне аб мерах па далейшаму ўдасканаленню работы Саветаў дэпутатаў працоўных у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, унесенае на абмеркаванне цяперашняй сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, мае выключную важнасць. Значэнне гэтага пытання вызначаецца той велізарнай роляй, якая ўскладзена на Саветы партыяй і народам, той вялікай работай, якую яны закліканы выканаць, ажыццяўляючы прадвызначэнні з'езда.

XXV з'езд КПСС азнаменаваў новы гістарычны рубеж у развіцці савецкага грамадства па шляху да камунізма, стаў буйней-

шай палітычнай падзеяй сучаснасці. У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС, «Асноўных напрамках развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады» падведзены вынікі велізарнай стваральнай работы Камуністычнай партыі і савецкага народа па выкананню рашэнняў XXIV з'езда, дзевятай пяцігодкі. У гэтых дакументах дадзена навуковае абгрунтаванне эканамічнай стратэгіі партыі, разгледжаны вузлавыя праблемы развіцця савецкай эканомікі на сучасным этапе, вызначаны задачы далейшай дзейнасці партыі па кіраўніцтву камуністычным будаўніцтвам.

У дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, у выступленнях дэлегатаў з'езда адзначалася, што гісторыя нашай краіны яшчэ не ведала такога шырокага размаху сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, які быў дасягнуты за мінулую пяцігодку. Зроблены новы буйны крок у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, павышэнні ўзроўню жыцця народа, у забеспячэнні бяспекі Савецкай дзяржавы.

У ажыццяўленне дзевятага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі краіны дастойны ўклад унеслі працоўныя Беларускай ССР. Дырэктывы XXIV з'езда КПСС былі выкананы па ўсіх асноўных галінах эканомікі, а па многіх важных пазіцыях — перавыкананы. Аб'ём прамысловай вытворчасці ўзрос на 64 працэнты. Дадаткова да плана выпушчана прадукцыі на 3 мільярды рублёў. Звыш заданняў, якія вынікаюць з Дырэктыў XXIV з'езда, выпушчана на 1 мільярд рублёў тавараў народнага спажывання. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці павысілася на 43 працэнты. Забяспечана паступальнае развіццё сельскай гаспадаркі. Вытворчасць збожжа павялічылася амаль у 1,6 раза, сярэднегадавая ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых склала 21,3 цэнтнера супраць 13,1 у восьмай пяцігодцы. Мяса ў грамадскім сектары атрымана на 45 працэнтаў, малака — на 25 працэнтаў і яек — у 2,6 раза больш, чым за папярэднія пяць гадоў. Значна перавыкананы заданні па продажу дзяржаве асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Ажыццёўлена шырокая праграма капітальнага будаўніцтва.

Вялікую ролю ў паспяховым вырашэнні задач дзевятай пяцігодкі адыграла ўзросшая актыўнасць Саветаў дэпутатаў працоўных. Можна з поўнай падставай сказаць, што ўся іх дзейнасць узнялася на новую, больш высокую ступень. Саветы сталі глыбей і канкрэтней займацца праблемамі эканомікі і культуры, сацыяльна-бытавога абслугоўвання і выхавання людзей, умацаваннем сацыялістычнай законнасці і грамадскага парадку. Узбагаціліся формы і метады іх арганізацыйна-масавай работы.

Усё гэта — вынік вялікіх клопатаў партыі аб усебаковым развіцці сацыялістычнай дэмакратыі, аб павышэнні ролі і аўтарытэту Саветаў. Асабліва многа зроблена для расшырэння іх правоў і магчымасцей на аснове рашэнняў XXIII і XXIV з'ездаў. Пастано-

вы ЦК КПСС «Аб паляпшэнні работы сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў працоўных», «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню работы раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў працоўных», іншыя пастановы і прынятыя ў адпаведнасці з імі заканадаўчыя акты стаяць у радзе буйнейшых мерапрыемстваў партыі па ўдасканаленню сістэмы дзяржаўнага і сацыяльнага кіравання грамадствам.

Умацаванне Савецкай дзяржавы, развіццё сацыялістычнай дэмакратыі было і застаецца важнейшым напрамкам дзейнасці партыі, Цэнтральнага Камітэта КПСС. «У галіне дзяржаўнага будаўніцтва,— указваў на XXV з'ездзе таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў,— асаблівую ўвагу партыя ўдзяляе **рабоце Саветаў.** У адпаведнасці з вынесенымі на XXIV з'ездзе прапановамі быў прыняты Закон аб статусе дэпутата, які дакладна вызначыў правы і абавязкі дэпутатаў, а таксама абавязкі дзяржаўных і грамадскіх органаў у адносінах да іх. Гэта прынесла адчувальныя вынікі. Па ініцыятыве дэпутатаў Саветаў цяпер ставіцца і вырашаецца шмат важных пытанняў».

У Справаздачным дакладзе XXV з'езду КПСС пастаўлена задача прыняць законы, якія вызначаюць кампетэнцыю краявых, абласных і акруговых Саветаў. Гэта яшчэ адно яскравае сведчанне няспынных клопатаў партыі аб удасканаленні дзейнасці ўсіх звенняў Саветаў.

Пастаянную ўвагу павышэнню ўзроўню работы Саветаў рэспублікі ўдзяляюць Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, мясцовыя партыйныя органы. Партыйныя камітэты аказваюць штодзённую дапамогу Саветам, умацняюць іх арганізуючую ролю ва ўздыме эканомікі, культуры, у камуністычным выхаванні працоўных. Узрасла партыйная патрабавальнасць да гаспадарчых кіраўнікоў за ажыццяўленне рашэнняў Саветаў, прапаноў дэпутатаў, наказаў выбаршчыкаў.

У цэнтры ўвагі ЦК, абкомаў, гаркомаў, райкомаў партыі знаходзяцца пытанні падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў савецкага апарату. Да кіраўніцтва ў Саветах за апошнія гады вылучана многа вопытных партыйных і іншых работнікаў, здольных весці справу кваліфікавана, на ўзроўні сучасных патрабаванняў. Цяпер усе старшыні выканкомаў абласных, гарадскіх і раённых Саветаў, амаль усе іх намеснікі, а таксама сакратары выканкомаў маюць вышэйшую адукацыю. Істотныя змены адбыліся ў саставе кадраў сельскіх і пасялковых Саветаў. Цяпер, як правіла, гэта добра падрыхтаваныя работнікі, многія з іх — дыпламаваныя спецыялісты народнай гаспадаркі і культуры. У рэспубліцы паспяхова дзейнічае сістэма навучання, якая ахоплівае ўсе звенні савецкага апарату, усіх дэпутатаў.

Адзначаючы ўзросшы ўзровень работы Саветаў, мы ўсведамляем тое, што прававыя і арганізацыйныя магчымасці, якія яны маюць, выкарыстоўваюцца яшчэ не ў поўнай меры. На XXVIII з'ез-

дзе Кампартыі Беларусі ўказвалася, што работа многіх Саветаў усё яшчэ не адпавядае ўскладзеным на іх задачам, што некаторыя савецкія органы ўхіляюцца ад клопатаў, звязаных з вырашэннем важных эканамічных і сацыяльных праблем.

Нам, таварышы дэпутаты, усім савецкім работнікам з гэтай крытыкі трэба рабіць сур'ёзныя вывады. Усе свае намаганні Саветы павінны сканцэнтраваць на ажыццяўленні задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС і XXVIII з'ездам Кампартыі Беларусі. Саветы, падкрэслівалася на XXV з'ездзе, закліканы рабіць яшчэ больш актыўны ўплыў на развіццё эканомікі і культуры, удзяляць неаслабную ўвагу павелічэнню вытворчасці тавараў для насельніцтва, добраўпарадкаванню гарадоў і вёсак, паляпшэнню народнай асветы, аховы здароўя, гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання.

На сесіях абласных, многіх гарадскіх і раённых Саветаў, на пасяджэннях выканкомаў абмеркаваны меры па выкананню гэтых задач. Напярэдзе вялікая, напружаная работа па паспяховаму ажыццяўленню шырокай эканамічнай і сацыяльнай праграмы, намечанай XXV з'ездам КПСС на дзесятую пяцігодку. Дзяржаўны пяцігадовы план цяпер дапрацоўваецца. Яго праект будзе ўнесены на разгляд Вярхоўнага Савета Саюза ССР. На чарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР будзе прадстаўлены на ваш разгляд, таварышы дэпутаты, праект пяцігадовага плана нашай рэспублікі. Галоўныя яго паказчыкі вызначаны «Асноўнымі напрамкамі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады», а таксама рашэннямі XXVIII з'езда Кампартыі Беларусі. Яны канкрэтызаваны ў Мерапрыемствах ЦК КПБ па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС, якія, як вы ведаеце, былі адобраны рэспубліканскім сходам партыйнага актыву і зацверджаны пленумам ЦК КПБ. У гэтым дакуменце, які ёсць ва ўсіх аблвыканкомах і гаррайвыканкомах, савецкім органам дадзены канкрэтныя даручэнні па кожнай галіне эканомікі. Саветы, іх выканкомы абавязаны прыняць вычарпальныя меры для таго, каб даручэнні ЦК КПБ былі поўнасцю і ўсюды выкананы.

Па сваіх асноўных задачах, па агульнай арыентацыі гаспадарчага развіцця дзесятая пяцігодка з'яўляецца лагічным працягам папярэдняга пяцігоддзя, далейшым развіццём генеральнага курсу нашай партыі і дзяржавы на планамернае паляпшэнне ўсіх бакоў жыцця, працы і быту савецкіх людзей. Дасягненню гэтай мэты служыць эканамічная стратэгія партыі, накіраваная на забеспячэнне дынамічнага і прапарцыяльнага развіцця грамадскай вытворчасці, павышэнне яе эфектыўнасці, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы, усямернае паляпшэнне якасці работы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі.

Дзесятая пяцігодка названа пяцігодкай эфектыўнасці і якасці. У дастасаванні да Саветаў, іх выканаўча-распарадчых органаў

сутнасць задачы павышэння эфектыўнасці і якасці заключаецца ў тым, каб узняць на новы, больш высокі ўзровень арганізацыю справы, палепшыць стыль кіраўніцтва, дабівацца аптымальнасці сваіх рашэнняў, дакладнасці, паўнаты і своечасовасці іх выканання.

Таварышы!

У Саветаў, ва ўсіх дзяржаўных і гаспадарчых органаў няма цяпер больш важнай справы, чым ажыццяўленне планаў і абавязацельстваў 1976 года — першага года дзесятай пяцігодкі. І гэта зразумела, бо добры пачатак у многім будзе вызначаць нашы далейшыя дасягненні, паспяховае выкананне пяцігадовага плана ў цэлым.

Працоўныя Беларускай ССР, як і ўсе савецкія людзі, прынялі на 1976 год высокія сацыялістычныя абавязацельствы. Нацыянальны даход намечана павысіць на 6,5 працэнта замест 5,5 па плану. Аб'ём прамысловай вытворчасці прадугледжана павялічыць на 7,5 працэнта супраць 6,1 па плану. Звыш плана трэба будзе выпусціць прамысловай прадукцыі на 280 мільёнаў рублёў, у тым ліку тавараў народнага спажывання — на 130 мільёнаў. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці намечана павысіць на 5,7 працэнта пры плане 4,5 і за кошт гэтага атрымаць каля 80 працэнтаў прыросту ўсёй прадукцыі.

У галіне капітальнага будаўніцтва трэба будзе датэрмінова ўвесці ў эксплуатацыю рад важных народнагаспадарчых аб'ектаў, на 9 працэнтаў перавысіць заданне па росту прадукцыйнасці працы, павысіць эфектыўнасць капітальных укладанняў і якасць будаўнічых работ.

Дзесятая пяцігодка ўпэўнена набірае тэмпы. У прамысловасці Беларусі план пяці месяцаў па рэалізацыі прадукцыі выкананы на 102,1 працэнта. Яе выпуск у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года павялічыўся на 7,8 працэнта. Звыш плана рэалізавана вырабаў на 144 мільёны рублёў. Прадукцыйнасць працы ўзрасла на 4,8 працэнта. Палепшыліся іншыя тэхніка-эканамічныя паказчыкі работы прадпрыемстваў.

Аднак, таварышы, аб'ектыўна ацэньваючы зробленае, трэба прама сказаць, што нашы дасягненні маглі быць больш значнымі. На жаль, некаторыя міністэрствы і ведамствы, мясцовыя савецкія органы ўсё яшчэ не ўдзяляюць належнай увагі пытанням павышэння эфектыўнасці вытворчасці, барацьбе за паляпшэнне ўсіх якасных паказчыкаў. Толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што ў рэспубліцы амаль 14 працэнтаў прадпрыемстваў не выканалі план пяці месяцаў па рэалізацыі прадукцыі, а 16,5 працэнта — па павышэнню прадукцыйнасці працы. Асабліва шмат такіх прадпрыемстваў у Лідзе, Рэчыцы, Пінску, Магілёве, Полацку і некаторых іншых гарадах і раёнах. Па такому важнейшаму эканамічнаму паказчыку, як рост прадукцыйнасці працы, прамысловасць рэспуб-

лікі хоць і выканала план, але яшчэ не выйшла на ўзровень сваіх абавязацельстваў.

Нездавальняюча складваецца становішча ў капітальным будаўніцтве. План пяці месяцаў па асваенню капітальных укладанняў выкананы ўсяго на 94 працэнты. Міністэрствамі прамысловага і сельскага будаўніцтва не забяспечана выкананне плана пяці месяцаў як па асваенню капітальных укладанняў, так і па росту прадукцыйнасці працы. Уведзена ў дзеянне толькі 28 працэнтаў жылля, якое павінна быць здадзена за першае паўгоддзе. За пяць месяцаў не поўнасцю асвоены капіталаўкладанні, якія выдзелены на гэты перыяд на будаўніцтва школ і дашкольных устаноў, бальніц і паліклінік, іншых аб'ектаў сацыяльна-бытавога прызначэння.

Адставанне капітальнага будаўніцтва выклікае сур'ёзны непакой. Цяперашні ўзровень работы многіх будаўнічых і праектных арганізацый, заказчыкаў не поўнасцю адпавядае патрабаванням XXV з'езда КПСС, ён не гарантуе выканання дзяржаўнага плана і тым больш сацыялістычных абавязацельстваў.

Час, таварышы, не чакае. Выканкомам Саветаў, міністэрствам і ведамствам трэба неадкладна разабрацца з кожным адстаючым прадпрыемствам, будоўляй, выпрацаваць і ажыццявіць меры, якія дадуць магчымасць выправіць становішча. Каб карэнным чынам палепшыць справу, неабходна, як гэта прадугледжана Мерапрыемствамі ЦК КПБ, настойліва ўдасканальваць праектаванне, планаванне і ў цэлым арганізацыю будаўнічай вытворчасці. Як вядома, з пачатку гэтага года Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР цалкам пераведзена на гаспадарчы разлік. Гэты эксперымент разлічаны на тое, каб ажыццявіць камплектна цэнтралізаванае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне будоўляў, лепш выкарыстаць фінансавыя рэсурсы, скараціць працягласць збудавання аб'ектаў, павысіць узровень індустрыялізацыі будаўніцтва. Саветы, іх выканаўчыя органы, дэпутаты павінны ўсямерна садзейнічаць шырокаму ўкараненню ў практыку прынцыпаў праводзімага эксперымента, дабівацца павышэння эфектыўнасці капітальных укладанняў, паспяховага выканання намечанай праграмы капітальнага будаўніцтва.

XXV з'езд КПСС у якасці адной з галоўных задач Саветаў указаў на неабходнасць удзяляць неаслабную ўвагу вытворчасці тавараў народнага спажывання. Таму з усёй сумы гаспадарчых пытанняў, якімі закліканы займацца Саветы, мне ўяўляецца неабходным больш падрабязна спыніцца іменна на гэтым баку іх дзейнасці.

У бягучай пяцігодцы выпуск тавараў народнага спажывання ў нашай рэспубліцы прадугледжваецца павялічыць на 33 працэнты. На расшырэнне галін, якія вырабляюць гэтыя тавары, намечана накіраваць каля 1 мільярда рублёў капітальных укладанняў. Трэ-

ба пабудаваць і рэканструяваць дзесяткі фабрык і заводаў. Важна, каб ход гэтай работы Саветы трымалі пад сваім неаслабным кантролем.

Штодзённай увагі патрабуюць да сябе дзеючыя прадпрыемствы, і перш за ўсё тыя з іх, якія не спраўляюцца з заданнямі па рэалізацыі прадукцыі і яе асартыменту. А такіх нямала, асабліва ў лёгкай, лясной і дрэваапрацоўчай, харчовай, мясной і малочнай прамысловасці. За мінулыя пяць месяцаў спажыўцы недаатрымалі ад іх на многія сотні тысяч рублёў баваўняных і шаўковых тканін, мэблі, піва і безалкагольных напіткаў, іншых прамысловых і прадуктовых тавараў.

Значную частку вырабаў павышанага попыту выпускаюць неспецыялізаваныя прадпрыемствы, у тым ліку саюзнага падпарадкавання. Аднак яны не заўсёды выконваюць заданні па колькасці і наменклатуры такіх вырабаў, іх якасных характарыстыках. Нават у Мінску, дзе вынікі ўвогуле нядрэнныя, за апошнія два гады неспецыялізаваныя прадпрыемствы горада ўзялі для асваення 96 узораў новых вырабаў, але асвоілі толькі дзесяць, а 63 наогул вярнулі назад. Нязначны выпуск тавараў народнага спажывання намечаны на бягучую пяцігодку аб'яднаннем «АўтаМАЗ», мінскімі заводамі шасцерань, маторным, «Ударнік», «Прамсувязь», заводам «Бабруйсксельмаш», аршанскім заводам «Чырвоны Кастрычнік», Гродзенскім заводам карданных валаў, Брэсцкім электрамеханічным заводам і іншымі.

«Не ўсе яшчэ зразумелі, — сказаў на XXV з'ездзе КПСС таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў, — што гэта — спроба велізарнага палітычнага і эканамічнага значэння, непасрэдна звязаная з выкананнем праграмных установак партыі».

Праблемай першараднага значэння з'яўляецца павышэнне якасці тавараў народнага спажывання. У мінулым годзе ўдзельная вага прадукцыі вышэйшай катэгорыі якасці ў агульным аб'ёме вытворчасці на прадпрыемствах міністэрстваў мясной і малочнай прамысловасці, харчовай, лясной і дрэваапрацоўчай, лёгкай прамысловасці склала ўсяго ад 2,5 да 4,2 працэнта. 35 прадпрыемстваў міністэрстваў лёгкай, мясной і малочнай, харчовай прамысловасці не забяспечылі выкананне плана 1975 года па вытворчасці вырабаў з дзяржаўным Знакам якасці.

Паводле даных органаў дзяржаўнага нагляду, штогод зніжаецца ў гатунковасці і вяртаецца прадпрыемствам для ліквідацыі дэфектаў 12—20 працэнтаў правяраемых швейных і трыкатажных вырабаў, 16—30 працэнтаў скуранога абутку, больш чым 20 працэнтаў мэблі, кожны дзесяты фотаапарат, кожная другая дзіцячая каляска. Многа нізкагатунковай прадукцыі выпускаюць прадпрыемствы, якія пастаўляюць харчовыя тавары. Так, у мінулым годзе больш чым 80 працэнтаў праверaных прадпрыемстваў Міністэрства харчовай прамысловасці БССР выраблялі прадукцыю з

парушэннем дзяржаўных стандартаў і тэхнічных умоў. Страты ад браку на прадпрыемствах гэтага міністэрства за пяцігодку перавысілі тры мільёны рублёў, у тым ліку за мінулы год — 738 тысяч.

Дрэнная якасць прадукцыі сведчыць не толькі аб парушэннях тэхналогіі, вытворчай дысцыпліны на многіх прадпрыемствах, а таксама і аб нізкай патрабавальнасці да іх кіраўнікоў, у тым ліку і з боку Саветаў. Нядаўна пастаянная камісія па прамысловасці Вярхоўнага Савета БССР разгледзела работу выканкома Віцебскага гарадскога Савета па ажыццяўленню кантролю за якасцю тавараў народнага спажывання. Віцебскі гарвыканком (старшыня В. П. Вараб'ёва), здавалася б, удзяляе немалую ўвагу гэтаму пытанню: заслухоўвае справаздачы гаспадарнікаў, прымае адпаведныя рашэнні, дае ўказанні. Аднак патрэбнай арганізатарскай работы ў працоўных калектывах ён не вядзе. Не дзіўна таму, што з 15 прадпрыемстваў горада, праверaных у мінулым годзе, 11 не выконвалі патрабаванняў дзяржаўных стандартаў. Цалкам была забракавана мэбля гарпрамкамбіната. У 1975 годзе швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» за пастаўку нізкагатунковай прадукцыі заплаціла 142 тысячы рублёў штрафаў. Абутковай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» у тым жа годзе вярнулі на выпраўленне 57 600 пар абутку, што на 15 тысяч больш, чым у 1974 годзе.

Ёсць нямала «вузкіх месц» і на прадпрыемствах іншых гарадоў і раёнаў вобласці. Таму правільна зрабіў Віцебскі аблвыканком, які вынес пытанне аб вытворчасці тавараў народнага спажывання на абмеркаванне сесіі абласнога Савета, якая адбывалася гэтымі днямі. Сесія прайшла актыўна, па-дзелавому. Выпрацавана добрае, канкрэтнае рашэнне, якое, трэба меркаваць, будзе ажыццёўлена.

Неабходна, каб усе мясцовыя Саветы, іх выканкомы, камісіі пастаянна трымалі ў полі зроку пытанні павелічэння выпуску, расшырэння асартыменту і паляпшэння якасці спажывецкіх вырабаў. Пры гэтым важна дабівацца ад гандлюючых арганізацый больш дасканалага, навукова абгрунтаванага вывучэння попыту насельніцтва, неабходна мацаваць садружнасць індустрыі і гандлю, павышаць адказнасць прамысловых і гандлюючых прадпрыемстваў за выкананне ўзаемных дагавораў. Саветам неабходна больш актыўна ўнікаць у работу непадведамных ім галін прамысловасці, шырэй выкарыстоўваць свае паўнамоцтвы пры планаванні ім і размяшчэнні вытворчасці тавараў народнага спажывання. Больш клопатаў аб галінах, якія задавальняюць штодзённыя патрэбнасці чалавека, аб паляпшэнні іх матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, эканамічным стымуляванні павінны праяўляць планавыя органы, усе звязаныя з гэтай справай міністэрствы і ведамствы.

На важным участку барацьбы за павелічэнне вытворчасці і расшырэнне асартыменту тавараў народнага спажывання знаходзіцца мясцовая прамысловасць. У гэтай пяцігодцы агульны аб'ём выпус-

каемай ёю прадукцыі намячаецца павялічыць на 35 працэнтаў, у тым ліку тавараў народнага спажывання — на 36 працэнтаў. Задачы сур'ёзныя. Каб паспяхова справіцца з імі, неабходна ўзняць узровень кіраўніцтва прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці, якія ёсць амаль у кожным горадзе і раёне і за работу якіх мясцовыя Саветы адказваюць самым непасрэдным чынам. За апошнія гады гэта галіна атрымала значнае развіццё, палепшылася яе тэхнічная аснашчанасць, праводзіцца спецыялізацыя, ствараюцца вытворчыя аб'яднанні. Аднак Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР, многія выканкомы Саветаў усё яшчэ мірацца з фактамі, калі рад прадпрыемстваў хранічна адстае, вядзе вытворчасць саматужна, выпускае брак. За пяць месяцаў гэтага года мясцовая прамысловасць недадала звыш 13 тысяч квадратных метраў паркету, 99 тысяч электрычных прасаў, 23 тысячы мясарубак, многа мэблі, каналізацыйных труб і іншай прадукцыі.

Сур'ёзным недахопам у рабоце мясцовай прамысловасці з'яўляецца тое, што кіраўнікі прадпрыемстваў, арыентуючыся ў асноўным на фандзіруемую, прывазную сыравіну, не турбуюць сябе пошукамі мясцовых рэсурсаў. Але якая ж гэта мясцовая прамысловасць без мясцовай ініцыятывы? Ад выканкомаў Саветаў патрабуецца арганізаваць справу так, каб як мага шырэй выкарыстоўваліся мясцовыя сыравіна і матэрыялы, а таксама адходы вытворчасці для значнага павелічэння выпуску і расшырэння асартыменту тавараў народнага спажывання.

Таварышы!

Задачы буйнога маштабу пастаўлены XXV з'ездам КПСС перад сельскай гаспадаркай. Дзяржава выдзяляе велізарныя капіталаўкладанні на расшырэнне комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў, хімізацыю, меліярацыю зямель, на сельскае будаўніцтва. Па сутнасці вырашаецца праблема пераводу сельскай гаспадаркі на індустрыяльную аснову.

Ажыццяўленне праграмы партыі па развіццю гэтай галіны будзе залежаць ад далейшага паляпшэння ўсёй нашай арганізатарскай, кіраўніцкай работы. Трэба, аднак, прызнаць, што далёка не ўсе Саветы, іх выканаўчыя камітэты, упраўленні сельскай гаспадаркі глыбока ўнікаюць у работу калгасаў і саўгасаў, аказваюць належнае ўздзеянне на развіццё іх эканомікі, на выкананне імі абавязацельстваў перад дзяржавай.

Не ўсюды вядзецца настойлівы пошук унутраных рэзерваў сельскагаспадарчай вытворчасці, прагрэсіўных форм арганізацыі працы і кіравання, шляхоў укаранення навейшых дасягненняў навукі і перадавога вопыту. Гэтым у значнай ступені тлумачыцца неаднастайнасць ва ўзроўні развіцця калгасаў і саўгасаў, нізкія тэмпы росту эканомікі многіх гаспадарак і нават цэлых раёнаў.

Жыццё настойліва патрабуе рашучай ліквідацыі недахопаў у кіраўніцтве сельскай гаспадаркай з боку савецкіх органаў. Гаворка

ідзе аб тым, каб забяспечыць высокія паказчыкі вытворчасці ў кожным калгасе, саўгасе, міжгаспадарчым аб'яднанні, аб тым, каб у цэлым узняць сельскую гаспадарку да ўзроўню найбольш развітых галін нашай эканомікі.

Сельскія працаўнікі Беларусі ўзялі на сябе абавязацельства ў гэтым годзе сабраць у сярэднім з кожнага гектара пасеваў збожжавых і зернебабовых 27—28 цэнтнераў, бульбы — 165, цукровых буракоў — 260, ільновалакна — 5, агародніны — 180 цэнтнераў. Вытворчасць мяса на сто гектараў сельгасугоддзяў павінна скласці 104 цэнтнеры і малака — 455 цэнтнераў. Прадугледжана значна павялічыць продаж дзяржаве ўсіх прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Працаўнікі вёскі настойліва змагаюцца за высокі ўраджай першага года новай пяцігодкі. Сяўба яравых культур у рэспубліцы праведзена ў аптымальныя тэрміны, пераважна насеннем высокіх кандыцый і найбольш ураджайных сартоў. У глебу ўнесена больш, чым у мінулым годзе, арганічных угнаенняў, больш эфектыўна выкарыстоўваюцца мінеральныя ўгнаенні. Цяпер пасевы азімых і яравых культур знаходзяцца ў асноўным у добрым стане.

Закладзена, можна сказаць, надзейная аснова для атрымання ўраджаяў на ўзроўні прынятых сацыялістычных абавязацельстваў. Задача Саветаў, Міністэрства сельскай гаспадаркі, «Белсельгастэхнікі», іншых сельскагаспадарчых органаў заключаецца цяпер у тым, каб забяспечыць старанны догляд пасеваў, узорна падрыхтавацца да ўборкі. Трэба яшчэ раз праверыць у кожным калгасе і саўгасе стан уборачнай тэхнікі, такоў, сушыльных агрэгатаў, складскіх памяшканняў, транспартных сродкаў. Важна загадзя прадумаць расстаноўку механізатарскіх кадраў, пытанні сацыялістычнага спаборніцтва на жніве, стымулявання людзей, іх бытавога і гандлёвага абслугоўвання. Узросшая тэхнічная аснашчанасць калгасаў і саўгасаў, майстэрства і энтузіязм сельскіх працаўнікоў, наяўны вопыт арганізатарскай работы — усё гэта дае нам магчымасць правесці ўборку сельскагаспадарчых культур арганізавана, у самыя кароткія тэрміны, без страт і паспяхова выканаць дзяржаўныя планы і абавязацельствы па продажу дзяржаве прадукцыі земляробства.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы